# УПЭЎНЕНЫ КРОК У БУДУЧЫНЮ

***Больш за 500 школьнікаў з усёй Віцебскай вобласці – навучэнцаў профільных класаў педагагічнай накіраванасці – прынялі ўдзел у прафарыентацыйным марафоне «Крок у прафесію», што праходзіў у ВДУ 10 лютага. У такім фармаце прафарыентацыйнае мерапрыемства праводзілася ўпершыню, і кожны факультэт падрыхтаваў сваю праграму для абітурыентаў. Забягаючы наперад, трэба адзначыць, што гасцям ВДУ вельмі спадабалася. Прычым як моладзі, так і настаўнікам, для якіх выкладчыкі факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі правялі дыялог з элементамі трэнінга на тэму «Ментальнае здароўе сучаснага педагога».***






Пачалося ўсё з працэдуры рэгістрацыі і працы прафарыентацыйных пляцовак у фае галоўнага корпуса. Пасля гэтага навучэнцаў чакала мерапрыемства ў актавай зале. Гасцей універсітэта вітала прарэктар Ірына Сёмкіна, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.

Ірына Аляксандраўна расказала пра асаблівасці паступлення выпускнікоў педагагічных, спартыўна-педагагічных і інжынерных класаў, пра тое, на якія спецыяльнасці яны могуць прэтэндаваць і што ім для гэтага неабходна. Таксама прарэктар падкрэсліла, што ў ВДУ моладзь чакае вельмі цікавае і насычанае студэнцкае жыццё, і абазначыла прычыны, чаму яна раіць выбіраць прафесію настаўніка. Да таго ж Ірына Аляксандраўна падзялілася асабістым вопытам, успомніўшы, як у свой час пасля заканчэння школы ніколькі не сумнявалася, куды падаць дакументы, і стала студэнткай ВДУ імя П.М. Машэрава, а сёння працуе ў любімай альма-матэр.

Пра запатрабаванасць педагагічных кадраў, асабліва настаўнікаў матэматыкі і фізікі, расказаў Дзмітрый Хама, начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Віцебскага аблвыканкама, дарэчы, выпускнік ВДУ.

– Наша задача сёння – дапамагчы старшакласнікам усвядомлена выбраць будучую прафесію, – пракаменціраваў Дзмітрый Леанідавіч. – І ў гэтым могуць дапамагчы профільныя класы педагагічнай накіраванасці. Спадзяюся, сёння ў гэтай зале тыя, хто ў будучым бачыць сябе педагогамі. Я сам па адукацыі – настаўнік матэматыкі і фізікі, пачынаў працоўны шлях у якасці настаўніка ў школе, зараз узначальваю ўпраўленне адукацыі. Як кіраўнік магу вам паабяцаць, што пасля заканчэння ўніверсітэта ў вас на доўгія гады будзе стабільная работа са стабільным заробкам. А тое, што ў ВДУ вы атрымаеце ўсе неабходныя для гэтага веды, я ніколькі не сумняваюся.

Падрабязней даведацца пра ўніверсітэт і студэнцкае жыццё моладзь змагла падчас прагляду прамаролікаў і выступаў творчых калектываў ВДУ, а пра дадатковыя магчымасці для юнакоў расказаў намеснік начальніка ваеннай кафедры Ігар Шабалін.

Пасля агульнага мерапрыемства навучэнцаў чакалі на сваіх пляцоўках факультэты ВДУ. Так, ФМіІТ запрасіў моладзь ў педагагічнае кафэ «КЛАСныя сустрэчы», ФФКіС – на майстар-клас «На спартыўнай хвалі», ФСПіП – на форум-тэатр «Пашыраем межы» і г.д.

Я ж пацікавілася ў некаторых старшакласнікаў, чаму яны плануюць паступаць у ВДУ.

**Максім ЧЫРЫКАЎ:**

– Я навучаюся ў інжынерным класе сярэдняй школы №45 г. Віцебска імя В.Ф. Маргелава. Гэта азначае, што ў нас па раскладзе больш урокаў матэматыкі і фізікі, а таксама для нас праводзяцца розныя прафарыентацыйныя мерапрыемствы. У ВДУ вучыўся мой родны дзядзька, які расказваў, што яму тут вельмі падабалася. Я разглядаю варыянт паступлення на факультэт матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій, бо лічу, што гэта перспектыўна.

**Дар'я МІРАШНІЧЭНКА:**

– Я навучаюся ў школе Шумілінскага раёна ў аграрным класе, але мару паступіць на факультэт сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі ВДУ, бо мне вельмі хочацца працаваць з людзьмі, дапамагаць ім. Сёння я шмат узаемадзейнічаю са школьным псіхолагам, чытаю спецыяльную літаратуру па псіхалогіі і ўпэўніваюся, што мне гэта вельмі цікава, і што менавіта з псіхалогіяй я хачу звязаць сваё жыццё. Ад студэнцтва я чакаю шмат цікавага, новых знаёмстваў і сяброў. Плану актыўна ўдзельнічаць у мастацкай самадзейнасці, а ў будучым бачу сябе школьным псіхолагам.

**Руслан СТЭЛЬМАХ:**

– Я навучаюся ў педагагічным класе Бычыхінскай сярэдняй школы імя І.М. Антонава. З другога класа цікаўлюся гісторыяй і краязнаўствам. Збіраюся паступаць на спецыяльнасць «Гістарычная адукацыя». Вельмі хачу стаць студэнтам ВДУ, таму спрабую розныя варыянты, у тым ліку ўдзельнічаю ва ўніверсітэцкай алімпіядзе. Я ўпэўнены, што важна ведаць і помніць сваю гісторыю.

**Алеся ДУБРОЎСКАЯ.**
**Здымкі Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**

Фота і відэарэпартаж з мерапрыемства глядзіце з дапамогай QR-кода.